УДК 94:929.55(476)"17/19"

**Л. С. Пухцеева**
Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»,
вул. Акадэмічная, 1, 220072 Мінск, Рэспубліка Беларусь, puhteeva.e@history.by

# ЭПІТАФІІ ЯК КРЫНІЦА ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ СВЕТАПОГЛЯДУ ШЛЯХТЫ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ У ПЕРЫЯД «ДОЎГАГА XIX СТАГОДДЗЯ»

Артыкул прысвечаны магчымасцям выкарыстання эпітафій як крыніц для вывучэння светапогляду шляхты беларускіх губерняў, асаблівасцям і складанасцям працы з падобнымі крыніцамі. Актуальнасць вывучэння эпітафій абумоўлена тым, што надмагільныя надпісы дапамагаюць выявіць светапогляд шляхты, адсачыць змены ў самаідэнтыфікацыі саслоўя, з'яўляюцца важным сведчаннем трансфармацый грамадства ў зменлівым сацыяльна-палітычным кантэксце. Робіцца выснова аб тым, што эпітафіі з надмагілляў шляхты дазваляюць вылучыць каштоўнасныя арыенціры прадстаўнікоў саслоўя, сфармуляваць саслоўны ўзоравы вобраз для пераймання. Выяўленыя цяжкасці працы з гэтымі крыніцамі звязаны са станам іх захаванасці, колькасцю прыдатных для аналізу надмагілляў і ступенню рэпрэзентацыі ўсіх пластоў шляхецкага грамадства.

**Ключавыя словы:** эпітафіі; надмагільныя надпісы; ментальнасць шляхты; шляхта беларускіх губерняў; «доўгае XIX стагоддзе».
Бібліягр.: 7 назваў.

**L. S. Pukhtseyeva**
The State Scientific Institution "The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus",
1 Academic Str., 220072 Minsk, the Republic of Belarus, puhteeva.e@history.by

# EPITAPHS AS A SOURCE FOR STUDYING THE WORLDVIEW OF THE GENTRY OF THE BELARUSIAN PROVINCES DURING "THE LONG 19TH CENTURY"

The article is devoted to the possibilities of using epitaphs as sources for studying the worldview of the gentry of the Belarusian provinces, the peculiarities and difficulties of working with such sources. The relevance of studying epitaphs is due to the fact that tombstone inscriptions help to identify the worldview of the gentry and to track changes in self-identification of the estate. Such sources serve as important evidence of the transformations of society in a changing socio-political context. It is concluded that epitaphs from the tombstones of the gentry allow us to identify the value benchmarks of the representatives of the estate, help to compose a class exemplary image for imitation. The identified difficulties in working with such sources are related to the state of their preservation, the number of tombstones suitable for analysis, and the degree of representation of all strata of gentry society.

**Key words:** epitaphs; tombstone inscriptions; mentality of the gentry; the gentry of the Belarusian provinces; "the long 19th century".
Ref.: 7 titles.

**Уводзіны.** Месцы пахаванняў з'яўляюцца важнымі сведчаннямі гісторыі рэгіёну. Надпісы на надмагіллях фарміруюць калектыўную памяць, фіксуюць эпоху, норавы, моду, адлюстроўваюць трансфармацыйныя працэсы, праз якія прайшло дадзенае грамадства. Пры гэтым, нягледзячы на ўсю значнасць эпітафій як крыніцы для вывучэння сацыяльнай гісторыі (у прыватнасці, гэта тычыцца гісторыі Беларусі перыяду «доўгага XIX стагоддзя»*), у айчыннай гістарыяграфіі не склалася трывалых традыцый выкарыстання дадзеных крыніц.

© Пухцеева Л. С., 2024

*«Доўгае XIX стагоддзе» — паняцце, уведзенае ў навуковы ўжытак Э. Хобсбаўмам; гістарычная, а не календарная эпоха, пад якой у гістарыяграфіі разумеецца перыяд ад Вялікай французскай рэвалюцыі (1789) да Першай сусветнай вайны (1914). У айчыннай гістарыяграфіі пад ёй разумеюць эпоху ад падзелаў Рэчы Паспалітай і ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі да пачатку Першай сусветнай вайны або рэвалюцыйных падзей 1917 года.

У межах вывучэння светапогляду шляхты надмагіллі з эпітафіямі могуць быць карыснымі для выяўлення маральных каштоўнасцяў і ідэалаў прадстаўнікоў саслоўя. Акрамя таго, падобныя крыніцы дазваляюць прасачыць адаптацыю асобна ўзятых шляхецкіх радоў да новых сацыяльна-палітычных умоў, працэс уключэння некаторых прадстаўнікоў саслоўя ў новую структуру грамадства.

У дадзеным артыкуле робіцца спроба разгледзець і ацаніць інфармацыйны патэнцыял эпітафій як крыніц для вывучэння светапогляду шляхты беларускіх губерняў перыяду «доўгага XIX стагоддзя».

**Матэрыялы і метады даследавання.** Даныя для артыкула збіраліся ў ходзе палявых работ на хрысціянскіх могілках, а таксама праз адпаведныя даведачныя выданні (у першую чаргу гэта тычыцца працы «Пецярбургскі некропаль», якая больш падрабязна будзе разглядацца ў іншых артыкулах) і інтэрнэт-рэсурсы, базы даных, праграмы, якія змяшчаюць фотаздымкі могілак ці іх апісанне. У Беларусі гэта ў асноўным краязнаўчыя блогі ў Інтэрнэце, але ёсць і спецыяльныя рэсурсы, такія як www.graves.by. Гэты сайт змяшчае каталог гістарычных могілак Беларусі з каардынатамі і фотаздымкамі надмагілляў, на якіх, аднак, часта бывае складана вычытаць надпісы. Таксама ў якасці прыкладу варта прывесці сайт, прысвечаны польскім (каталіцкім) могілкам у Магілёве [1]. Нягледзячы на тое, што, па словах стваральнікаў сайта, яго мэтай з’яўляецца «захаванне гістарычнай памяці пра палякаў, якія раней пражывалі ў Магілёве і яго ваколіцах», ён змяшчае таксама нямала даных па прадстаўнікоў беларускага набілітэту, якіх, верагодна, аўтары рэсурса залічылі да палякаў на падставе іх веравызнання.

Сярод замежных крыніц інфармацыі варта вылучыць электронную базу даных могілак Росы ў Літве*, дзякуючы якой можна знайсці пахаванні па канкрэтным перыядзе, атрымаць іх падрабязнае апісанне і фотаздымкі (прычым, што важна, у даволі добрай якасці і з розных бакоў) [2]. Акрамя гэтага, у базе змяшчаецца інфармацыя пра стан захаванасці, матэрыял, з якога зроблены помнікі, дэфекты надмагілляў і інш.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Зробленае намі папярэдняе даследаванне нарматыўнай дакументацыі ў азначанай сферы дазваляе меркаваць, што ў Расійскай імперыі заканадаўча рэгламентаваліся агульныя пытанні ўладкавання могілак, у першую чаргу гэта тычылася выканання санітарна-эпідэміялагічных правілаў, а таксама розных аспектаў арганізацыі гарадской прасторы [3]. Пры гэтым не было спецыфічнай цэнзуры ў дачыненні да надмагільных надпісаў (меліся некаторыя патрабаванні да пахаванняў, што знаходзіліся ўнутры храмаў, але яны вызначалі толькі тое, што надпісы павінны былі быць прыстойнымі) [4]. Як нам падаецца, той факт, што змест эпітафій заставаўся па-за кантролем дзяржавы, павышае інфармацыйны патэнцыял дадзеных крыніц і іх каштоўнасць для даследчыкаў.

Для шляхецкага стану нанясенне эпітафій на надмагілле з’яўлялася разам з напісаннем мемуараў фундацыяй храмаў, важным спосабам захавання памяці пра сябе. Зыходзячы з таго, што надмагілле павінна было выконваць рэпрэзентатыўную функцыю, лагічна меркаваць, што на ім змяшчалася самая істотная інфармацыя, якая магла б стварыць для наступных пакаленняў паўнавартасны вобраз «ідэальнага» шляхціца, прадстаўніка свайго роду. Зразумела, што памерлы мог і не характарызавацца такімі якасцямі і насамрэч не з’яўляўся «ідэальным», але ў межах нашага даследавання важна тое, што падобныя надпісы паказваюць, якія рысы цаніліся саслоўем у людзях, якім сацыяльным нормам яны імкнуліся адпавядаць. Акрамя гэтага, магіла чалавека з’яўлялася яго «месцам апошняга прытулку», а таму мела вартасць як асаблівае памятнае месца для нашчадкаў спачылай асобы. Таксама каштоўнасць даных, якія абіралі для эпітафіі, абумоўлена існаваннем істотных абмежаванняў, звязаных з памерамі

*У красавіку 2024 года рэсурс быў узламаны. На момант падачы артыкула сайт яшчэ не аднавіў сваю дзейнасць.

надмагілляў, коштам іх вырабу і нанясеннем надпісаў. Такім чынам, для надмагільнага надпісу абіралі толькі самую важную інфармацыю, якую хацелі пакінуць пра нябожчыка. У выніку даследчык мае крыніцу, у сціплым маштабе якой канцэнтруюцца вельмі карысныя даныя.

Звычайна ў эпітафіях пісалі, якім выбітным быў памерлы чалавек, называлі яго шляхетныя ўчынкі, рабілі акцэнт на нейкай пасадзе, якую чалавек займаў і праз гэта клапаціўся пра лёс іншых людзей ці краю. У якасці канкрэтнага прыкладу так званай інфарматыўнай эпітафіі можна прывесці магілу Адольфа Янушкевіча ў в. Дзягільна: *ADOLF JANUSZKIEWICZ / Z DUCHA, SERCA I MYŚLI, Z CNÓT, OFIAR I CZYNÓW, / BÓG NIE MIAŁ SŁUG WIERNIEJSZYCH, KRAJ GODNIEJSZYCH SYNÓW. / OBYWATEL Z WYZNAWCY NIEZACHWIANĄ SIŁĄ. / PRZECHODNIU! NIE ZAŃ TYLKO NAD JEGO MOGIŁĄ, / LECZ MÓDL SIĘ I ZA SIEBIE: BY PRZEZEŃ UPROSIĆ, / TAK ŻYĆ, WIERZYĆ I KOCHAĆ, TAK CIERPIEĆ I ZNOSIĆ.* Варта ўдакладніць, што існуючае зараз надмагілле — гэта копія, паколькі арыгінал быў зруйнаваны, але ў дакладнасці тэксту эпітафіі можна не сумнявацца, пра што сведчаць даныя археолагаў, якія займаліся раскопкамі магілы А. Янушкевіча [5, с. 82], а таксама мемуары А. Адынца, які прыводзіць цытату дадзенай эпітафіі, меркаваным аўтарам якой ён сам і з’яўляецца [6, с. 150]. З тэксту вынікае, што для памерлага быў характэрны шэраг выбітных маральных якасцяў, ён з’яўляўся цалкам адданым Богу чалавекам, патрыётам і ўзоравым грамадзянінам. Цікава тое, што ў вачах уладаў Расійскай імперыі А. Янушкевіч, які прымаў удзел у паўстанні 1830—1831 гадоў, прыгаворваўся да смяротнага пакарання (пасля прысуд быў заменены вечнай ссылкай у Сібір), правёў амаль 25 гадоў у выгнанні, патрыётам або ўзорным грамадзянінам не выглядаў.

Яшчэ адзін прыклад — магіла Уладзіміра Цеханавецкага ў г. Магілёве: *S.P. WŁODZIMIERZ / CIECHANOWIECKI / B. MARSZAŁEK SZLACHTY GUB. MOHYLEWSKIEJ / ZGASŁ W PANU D. 3 WRZEŚNIA 1900 R. / BYŁ CZŁOWIEKIEM WEDŁUG SERCA BOŻEGO, / NAJLEPSZYM MĘŻEM I OJCEM, / DLA RODZINY I PRZYJACIOŁ SERCEM WYLANY, / DLA BIEDNYCH OJCEM, / CZEŚĆ I POKÓJ JEGO ZACNEJ DUSZY.* Як бачым, дадзенае надмагілле адлюстроўвае, што памерлы быў маршалкам шляхты, з’яўляўся чалавекам рэлігійным, адданым сям’і і сябрам, апекуном бедных. Атрымліваецца даволі прывабны партрэт прадстаўніка свайго саслоўя.

Пры вывучэнні дадзеных крыніц можна заўважыць, што большасць надмагілляў, эпітафіі з якіх падыходзяць для аналізу па нашай тэме, належаць мужчынам. Менавіта на мужчынскіх надмагіллях шляхта імкнулася падрабязна (наколькі гэта было магчыма) распісаць, якім быў гэты чалавек, адзначыць карысць, якую ён прынёс людзям, і г. д. Націск рабіўся на асабістыя якасці і заслугі чалавека, хаця апошнія і маглі быць даволі расплывістымі. Сярод жаночых надмагілляў значная частка эпітафій ці наогул не транслюе патрэбнай для нас інфармацыі (на такіх надмагіллях звычайна пішуцца толькі гады ці працягласць жыцця памерлай, часам пазначаецца, з якога яна паходзіла роду), ці паказвае любоў родзічаў да жанчыны і іх перажыванні ў сувязі з яе сконам, але такая інфармацыя не звязана непасрэдна з асобай самой памерлай.

Нягледзячы на гэта, жаночыя надмагіллі таксама могуць быць карыснымі для нашага даследавання, але яны даволі выразна адрозніваюцца ад мужчынскіх: на іх звычайна сярод пазітыўных якасцяў жанчыны называюцца тыя, што звязаны з яе роллю маці ці жонкі. Акрамя таго, з некаторай доляй умоўнасці ў даследаванні нашай тэмы мы можам аналізаваць жаночыя эпітафіі, па якіх бачна, як прафесійная/службовая дзейнасць мужа памерлай распаўсюджвалася і на яе. Так, нярэдка сустракаюцца надмагіллі «жонак палкоўнікаў», «тытулярных саветніц» і г. д. Эпітафію з усім вышэй пералічаным знаходзім на надмагіллі Язэфы Саковіч (каталіцкія фарныя могілкі ў г. Гродне): *J. W. Radczyni / Józefie z Ianiewiczów / SAKOWICZOWEJ / DOBREJ MATCE I ŻONIE / TEN POMNIK ŻALU W PAMIĘC / JEJ CNÓT DOMOWYCH JAKO / WZÓR DO NAŚLADOWANIA / DLA JEJ DZIECI / MAŻ ZASMUCZONY POSTAWIŁ / UMARŁA 22 WRZESNIA 1848 R. / ŻYLA LAT 29 / POKÓJ JEJ CIENIOM.*

Для параўнання мужчынскага і жаночага надмагілляў прывядзем наступныя эпітафіі. Першая належыць Францішку Баркоўскаму: *FRANCISZEK / BORKOWSKI / UR. 27 LISTOPADA 1803. / STUDENT UNIWERSYTETU / WILEŃSKIEGO 1826. / ŻOŁNIERZ KAUKAZU / NIŻEGORODZKICH DRAGONOW /1828. / GENERAŁ-MAJOR 1863. / † 24 MARCA 1871. /POKOJ*

*JEGO POPIOLOM.* Другая эпітафія — з надмагіля Марыі Сушыньскай: *TU SPOCZYWA OBOK MATKI MEŻA / S P: MARYA z SUMOWSKICH / SUSZYŃSKA / ZONA INŻYNIERA / ZESLA Z TEGO SWIATA / W 22 ROKU ŻYCIA / DNIA 9 PAZDZ. 1876 R.* Такім чынам, на гэтым прыкладзе мы бачым, што надмагілле Ф. Баркоўскага даволі падрабязна адлюстроўвае жыццёвы шлях памерлага, інфармацыю пра яго адукацыю, прасоўванне па кар'ернай лесвіцы, а надмагілле М. Сушыньскай з асабістых дасягненняў памерлай паказвае хіба што тое, што яна была жонкай інжынера. У выніку мы можам зрабіць выснову аб гендэрным характары шляхецкіх эпітафій, якія праяўляецца ў тым, што пазітыўныя якасці чалавека, якія выносіліся на надмагіллі, залежалі ад палавой прыналежнасці памерлага. Дадзеная акалічнасць дазваляе нам выявіць сацыяльныя чаканні, што існавалі ў шляхецкім асяроддзі ў дачыненні да мужчын і жанчын.

Як вядома, пасля ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі частка шляхты адмовілася прымаць новыя рэаліі, заставалася варожа настроенай у адносінах да царскай улады, чыноўніцтва і вайскоўцаў і чакала адраджэння страчанай дзяржаўнасці, а прадстаўнікі іншай часткі, наадварот, па тых ці іншых прычынах прынялі новыя ўмовы жыцця і сталі шукаць сваё месца ў новым соцыуме. Такія з'явы таксама знаходзілі адлюстраванне ў эпітафіях памерлых прадстаўнікоў саслоўя. У рамках вывучэння светапогляду шляхты нас асабліва цікавяць надмагіллі тых людзей, якія перайшлі/паступілі на службу Расійскай імперыі, паколькі іх эпітафіі дазваляюць разгледзець, як змянялася самасвядомасць такога чалавека (ці, наадварот, як яе імкнуліся захаваць), як ён ставіўся да свайго жыццёвага выбару.

Так, напрыклад, перайшоў на рускую службу з польскай Вінцэнт Гечан-Гечэвіч, тайны саветнік, сенатар, мінскі губернатар. У 1-м томе даведачнага выдання «Пецярбургскі некропаль» прыводзіцца наступная інфармацыя пра яго пахаванне: «Гечанъ-Гечевичъ, Винцентъ, сенаторъ, тайн, сов., кавалеръ Россійскихъ орденовъ, р. 5 апрѣля 1770 † 19/31 марта 1840. Надпись по-польски (Смоленское евангелическое кладбище» [7, с. 593]. Такім чынам, мы бачым, што на службе ў «новай» айчыне памерлы змог дасягнуць значных вышынь, заняў сваё месца ў іерархіі расійскага чыноўніцтва. Паколькі менавіта такая эпітафія была абраная для характарыстыкі В. Гечан-Гечэвіча для нашчадкаў, можна меркаваць, што блізкія памерлага (ці ён сам у выпадку, калі пакінуў якія-небудзь інструкцыі датычна свайго пахавання) шанавалі яго жыццёвыя дасягненні і ганарыліся ім. Пры гэтым польская мова эпітафіі, верагодна, была абрана як сродак захавання нейкай часткі ідэнтычнасці, павінна была служыць своеасаблівым адрозніннем, той дэталлю, якая б не дазволіла гэтаму пахаванню зліцца ў адну масу пахаванняў расійскіх чыноўнікаў.

У дачыненні да надмагілляў служылых асобаў на праваслаўных могілках варта адзначыць, што значны адсотак такіх пахаванняў належыць не выхадцам з беларускіх губерняў, а чыноўнікам і іншым асобам, якіх на нашы землі з унутраных тэрыторый Расійскай імперыі прывёў абавязак службы. Эпітафіі з такіх надмагілляў для нашага даследавання не падыходзяць, але могуць быць карыснымі пры вывучэнні іншых тэм.

Можна вылучыць шэраг праблемных момантаў і складанасцяў, якія ўзнікаюць падчас працы з такімі крыніцамі. Па-першае, як ужо адзначалася вышэй, надмагіллі і эпітафіі на іх каштавалі даволі дорага. Акрамя ўсяго іншага, гэта прывяло да таго, што гэтыя крыніцы не рэпрэзентуюць значны пласт шляхецкага саслоўя (у першую чаргу гэта тычыцца дробнай шляхты) — тых, хто не мог сабе дазволіць дарагія надмагіллі і таму звярталіся да больш танных варыянтаў (напрыклад, да выкарыстання дрэва замест каменя, усталёўвання на магіле крыжа замест помніка і інш.) ці наносіў самыя сціплыя надпісы.

Другая значная праблема — гэта захаванасць такіх надмагілляў. У першую чаргу такую праблему можна звязаць з натуральным разбурэннем могілак (у агульным) і надмагілляў (у прыватнасці) з-за эрозіі, з-за таго, што з цягам часу яны сыходзяць пад зямлю, зарастаюць, разбураюцца расліннасцю і г. д. У выніку тэкст эпітафіі на такіх надмагіллях немагчыма прачытаць. У якасці канкрэтнага прыкладу могілак, што амаль зніклі ў выніку разбурэння, можна прывесці

вясковыя могілкі ў в. Ясенец. Другі фактар, які ўплывае на захаванасць могілак, — мэтанакіраванае разбурэнне і іншыя праяўленні антрапагеннага ўздзеяння, звязаныя са знішчэннем цэлых могілак ці іх асобных частак для будоўлі, у сувязі з наступствамі баявых дзеянняў і інш.

Трэцяя складанасць — малая колькасць надмагілляў, якія падыходзяць для нашага даследавання. Большасць эпітафій усё ж менш персаніфікаваная, створаная па пэўных узорах і стандартах, на іх звычайна пазначаецца імя памерлага, даты нараджэння і смерці, колькасць пражытых гадоў, ад каго пастаўлены помнік, сустракаюцца таксама малітвы, цытаты з Бібліі ці рэлігійнай літаратуры. Стандартныя фразы і цытаты (за некаторымі выключэннямі) не маюць вялікай каштоўнасці для вывучэння нашай тэмы. Акрамя гэтага, неабходна таксама даказаць, што надмагілле належыць менавіта прадстаўніку мясцовай шляхты, а не іншай сацыяльнай групы, з чым часам таксама ўзнікаюць цяжкасці, што можа ў выніку яшчэ больш скараціць лік прыдатных для аналізу эпітафій.

**Заключэнне.** Эпітафіі з’яўляюцца спецыфічнай, але інфарматыўнай і вартай разгляду дадатковай крыніцай па гісторыі светапогляду шляхты. Надмагільныя надпісы адлюстроўваюць набор якасцяў і ўласцівасцяў, якія выбудоўвалі вобраз «ідэальнага» прадстаўніка саслоўя. Падобныя рысы цаніліся шляхецтвам, вызначалі яго паводзіны і транслявалі саслоўныя каштоўнасці. Эпітафіі шляхты маюць выразны гендэрны характар, які дэманструе сацыяльныя чаканні, што існавалі ў шляхецкім асяроддзі ў дачыненні да мужчын і жанчын. Надпісы на надмагіллях прадстаўнікоў саслоўя сведчаць пра ўключэнне часткі набілітэту ў новае грамадства праз ваенную ці чыноўніцкую службу, паказваюць, як змянялася, а таксама як захоўвалася ідэнтычнасць гэтых людзей. Асноўныя складанасці, з якімі можа сутыкнуцца даследчык падчас працы з такімі крыніцамі — гэта іх малалікасць, кепская захаванасць і адсутнасць прадстаўленасці шырокіх пластоў шляхецкага саслоўя.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Polski cmentarz w Mohylewie : [сайт]. — Рэйк’явік, 2016—2024. — URL: https://polski-cmentarz.info (дата звароту: 23.11.2023).
2. Cmentarz na Rossie w Wilnie. Badania inwentaryzacyjne : [сайт]. — Варшава, 2015—2023. — URL: http://cmentarznarossie.uksw.edu.pl/index.php (дата звароту: 23.11.2023).
3. *Чижевский, И.* Благоустройство кладбищ / И. Чижевский // Устройство православной российской церкви: ее учреждения и действующие узаконения по ее управлению / И. Чижевский. — Харьков : Тип. Губ. правл., 1898. — От. 4, гл. 9. — С. 124—131.
4. О том, что внутри церквей нельзя делать монументы в виде статуй, бюстов и т. п. : постановление Святейшего правительствующего синода от 12 окт. 1831 г. № 392 // Полное собрание постановлений и распоряжений по ведомству православного исповедания Российской империи. — 1825—1835. — Т. 1.
5. *Крывальцэвіч, М. М.* «Старыя» могілкі XIX — пачатку XX ст. у вёсцы Дзягільна Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці: прыклад выратавання, археалагічнага даследаваня і мемарыялізацыі / М. М. Крывальцэвіч // Матэрыялы па археалогіі Беларусі : навук. зб. — Мінск, 2018. — Вып. 29, Даследаванні пахавальных і пасяленчых помнікаў эпохі сярэдневякоўя і Новага часу на тэрыторыі Беларусі і суседніх краін. — С. 73—83.
6. *Odyniec, A. E.* Wspomnienia z przeszłości opowiadane Deotymie / A. E. Odyniec. — Warszawa : Nakład Gebethnera i Wolffa, 1884. — 459 s.
7. *Саитов, В. И.* Петербургский некрополь : в 4 т. / В. И. Саитов. — СПб. : Тип. М. М. Стасюлевича, 1912—1913. — Т. 1 : А—Г. — XX, 715 с.


Паступіў у рэдакцыю 09.09.2024.